**СТОП НИЩЕТА И УНИЖЕНИЕ!**

**ВЕРНИ ПРАВА И УВАЖЕНИЕ!**

**8 октября 2011**

# НАРОДНЫЙ СХОД

## ПРАЕКТ РЭЗАЛЮЦЫІ МЯСЦОВАГА СХОДУ ГРАМАДЗЯНАЎ – НАРОДНАГА СХОДУ

**Мы патрабуем:**

1. Спыніць рост цэнаў.
2. Індэксаваць:
- Заработную плату, пэнсіі, стыпэндыі, грашовыя дапамогі адпаведна росту цэнаў;
- Рублёвыя ўклады насельніцтва паводле курсу рубля на 1 студзеня 2011 г.
3. Адмяніць сыстэму прымусовых кароткатэрміновых кантрактаў.
4. Стымуляваць гаспадарчую ініцыятыву, даць прадпрымальнікам магчымасьць бесьперашкодна ствараць новыя працоўныя месцы.
5. Забясьпечыць грамадзянам магчымасьць свабодна купляць валюту і вяртаць валютныя крэдыты ў беларускіх рублях.
6. Спыніць палітычны перасьлед у краіне і неадкладна вызваліць усіх палітычных вязьняў.
7. Вярнуць народу Беларусі права фармаваць уладу ў сваёй краіне праз свабодныя, дэмакратычныя і справядлівыя выбары.

**Мясцовы сход можа ўключыць у рэзалюцыю і пункт пра мясцовую праблему.**



## НАРОДНЫ СХОД ЯК РУХ

### 8 простых адказаў на 8 тыповых пытанняў

**1) Дзе створаныя мясцовыя аргкамітэты Народнага сходу?**
У 29-ці гарадах: Мінск, Барысаў, Смалявічы, Жодзіна, Вілейка, Салігорск, Слуцк, Сьвіслач, Віцебск, Дзісна, Полацак, Наваполацк, Орша, Магілёў, Бабруйск, Гомель, Мазыр, Сьветлагорск, Жлобін, Рагачоў, Рэчыца, Брэст, Баранавічы, Кобрын, Бяроза, Івацэвічы, Гродна, Ліда, Слонім.

**2) Дзеля чаго зьбірацца на Народныя сходы і што на іх будуць вырашаць?**
Народныя сходы:
• абмяркуюць становішча ў эканоміцы, у сваім горадзе і ў дзяржаве наагул;
• прымуць патрабаваньні да ўладаў спыніць рост цэнаў, выканаць абяцанкі наконт заробкаў, спыніць валютнае махлярства, адмяніць кароткатэрміновыя кантракты;
• запатрабуюць аднавіць законнасьць у краіне, вы-зваліць усіх палітычных вязьняў, правесьці свабодныя выбары прэзідэнта і парлямэнту;
• выберуць паўнамоцных прадстаўнікоў, якія занясуць народныя патрабаваньні прадстаўнікам улады;
• вырашаць правесьці новыя сходы праз месяц – 12 лістапада.
Чым болей людзей будзе 8 кастрычніка, чым больш актыўна людзі падтрымаюць прынятыя патрабаваньні і прыйдуць яшчэ і 12 лістапада, тым больш актыўна Эўрапейскі Зьвяз і ЗША пачнуць дамагацца ад рэжыму вызваленьня палітвязьняў і свабодных выбараў, тым хутчэй ўлада мусіць прыслухацца да народных патрабаваньняў.

**3) Ці ўлады ня будуць перашкаджаць Народным сходам?**
Народныя сходы адбываюцца ў строгай адпаведнасьці з Канстытуцыяй і Законам Рэспублікі Беларусь "Аб рэспубліканскіх і мясцовых сходах". Мясцовыя сходы право-дзяцца па ініцыятыве 10% жыхароў, месца правядзеньня і тэмы гаворкі вызначаюць самі жыхары.
Улады пачалі адпускаць палітвязьняў, не разганялі сілай "маўклівую акцыю" 21 верасьня. Ва ўмовах крызісу рэжым баіцца эканамічных санкцыяў з боку ЗША і Эўрапейскага Зьвязу.

**4) Што трэба рабіць паміж 8 кастрычніка і 12 лістапада?**
Данесьці інфармацыю аб народных патрабаваньнях да кожнага грамадзяніна Беларусі і арганізаваць Народныя сходы 12 лістапада ва ўсіх гарадах Беларусі.

**5) Калі ўлада праігнаруе патрабаваньні Народных сходаў і да 12 лістапада ня дасьць ніякага адказу, што рабіць?**
Тады на Народных сходах 12 лістапада будзе прынятае рашэньне аб падрыхтоўцы да правядзеньня усеагульнага страйку (забастоўкі) як цалкам за-коннага і мірнага сродку барацьбы грамадзянаў за свае сацыяльныя і грамадзянскія правы. Паводле Канстытуцыі, "Грамадзяне маюць права на абарону сваіх эканамічных і сацыяльных інтарэсаў, уключна з (...) правам на забастоўку" (арт. 41).

**6) Ці рэальна сёньня правесьці ўсеагульную забастоўку?**
Сёньня ўсеагульная забастоўка маларэальная. Але калі весьці масавую прапаганду гэтага эфэктыўнага (прытым законнага і мірнага) сродку барацьбы за свае правы, на фоне непазьбежнага пры гэтым рэжыме пагаршэньня умоваў жыцьця, то да сярэдзіны вясны наступнага году ўсё магчыма. Але пад ляжачы камень вада не цячэ, і каб усеагульны страйк стаў рэальнасьцю, неабходная інтэнсіўная праца ўсіх прыхільнікаў дэмакратычных зьменаў.

Продолжение на стр. 2

## Нас павінен абараняць закон

Калі старанна пашукаць, можна высьветліць, што ў Беларусі прынята нямала правільных і разумных законаў. Але часта людзі ня ведаюць, што ёсьць законы, якія павінны абараняць іхныя правы. Іншая справа – ці рэальна дзейнічаюць гэтыя законы.
Адзін зь іх – Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2000 г. № 411-З "Аб рэспубліканскіх і мясцовых сходах". Пакуль што толькі А. Лукашэнка ваўсю карыстаецца гэтым актам, склікаючы ўсім вядомыя "Усебеларускія народныя сходы", якія трапны народны язык ахрысьціў "вялікімі народнымі хураламі".
Але той жа самы Закон дае права і звычайным людзям самім зьбірацца ў сваім горадзе, раёне ці квартале ды абмяркоўваць пытаньні, "у тым ліку рэспубліканскага значэння, якія закранаюць інтарэсы грамадзян адпаведнай тэрыторыі" (артыкул 14 Закону). Калі 1/10 жыхароў мікрараёну ці кварталу паставіць подпісы за мясцовы сход, ніякіх іншых дазволаў не патрабуецца. Ня трэба і прасіць ва ўлады месца правядзеньня сходу, гэта вырашаюць самі жыхары. Вядзе сход не выканкамаўскі чыноўнік, а той, каго вызначаць жыхары (арт. 12).
Паводле арт. 13-га Закону, рашэньні мясцовага сходу прымаюцца простай большасьцю галасоў яго ўдзельнікаў, пры гэтым галасаваньне можа быць адкрытым або тайным. "Сход мае права зьвяртацца ў дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі, якія абавязаны ва ўстаноўленым парадку разгледзець гэтыя звароты і аб прынятых па іх рашэньнях інфармаваць грамадзянаў, якія пражываюць на адпаведнай тэрыторыі".
Пагадзіцеся: неверагодна дэмакратычны закон, і нават дзіўна, што народ яго пакуль не выкарыстоўвае.
Прадбачу скептычныя ўсьмешкі: маўляў, закон як дышла, куды ўлада паверне – туды і выйшла. Гэта так. Але ж настала пара, калі толькі самі людзі здольныя абараніць сваё права на годнае жыцьцё, на дабрабыт, на павагу да сябе з боку ўлады, на асабістую свабоду, на культурнае асяродзьдзе.
І такія законы трэба абавязкова скарыстаць.
Пару гадоў таму я ўдзельнічаў у падрыхтоўцы такога мясцовага сходу. Гэта было ў кварталах прыватнага сэктару ў Менску, прылеглых да вуліцы Багдановіча (г. зв. "Сельгаспасёлак"). Там нельга будаваць вялікія дамы, бо раён стаіць на ваданосных жылах, артэзіянскі водазабор "Навінкі" забясьпечвае чыстай вадой палову сталіцы. Тым ня менш пачаў рыхтавацца масавы знос прыватных дамоў, каб расчысьціць прастору для маскоўскіх будаўнічых алігархаў, у тым ліку для Лужкова-Батурынай. Людзі абурыліся. Сышліся на сход, які ніхто з уладаў не пасьмеў пальцам крануць. Бо сабраўся НАРОД. І ў выніку ўлады часова адступілі.
Народныя сходы праводзіць трэба абавязкова. Гучна заявіць пра мясцовыя праблемы – карупцыю, незаконнае будаўніцтва, хабарніцтва і хамства чыноўнікаў. І шырэй – пра цэны і заробкі, валюту і крэдыты, мэдыцыну і адукацыю. І разумець, што каб была справядлівасьць, мы самі павінны браць свой лёс у свае рукі. Закон дазваляе.

*Вінцук Вячорка*

# НАРОДНЫ СХОД ЯК РУХ

**7) Нават калі атрымаецца правесьці ўсеагульны страйк і дамагчыся свабодных выбараў, ці здолее апазыцыя вылучыць адзінага кандыдата на прэзідэнта, вылучыць сваіх кандыдатаў ва ўсе акругі па выбарах у Палату прадстаўнікоў і мясцовыя саветы, запоўніць сваімі прадстаўнікамі ўсе выбарчыя камісіі і забясьпечыць татальнае назіраньне за выбарамі?**

“Традыцыйная” апазыцыя ў такім стане, што пералічаныя задачы ёй не па сілах. Сёньня апазыцыянэры падзяліліся на тых, хто мае розум, сілы і сьмеласьць ісьці да народа (і ўсе яны ўваходзяць у аргкамітэты Народных сходаў), і тых, хто прыняў стратэгію “чаканьня, выківаньня, самазахаваньня”.

Але менавіта праз Народныя сходы ёсьць рэальная магчымасьць далучыць да вырашэньня ўсіх названых задачаў дзясяткі тысячаў новых людзей з трывалымі дэмакратычнымі поглядамі.

**8) Што можа залежаць ад удзелу ці няўдзелу аднаго простага “маленькага” чалавека?**

Калі чалавек адзін – то ён сапраўды мала што можа зрабіць. Але калі “простых людзей” шмат, калі яны аб'ядналіся агульнай мэтай і агульнай працай, то гэта ўжо Народ, які перамагчы немагчыма. Як казаў падчас выбарчай кампаніі кандыдат у прэзідэнты Андрэй Санькікаў – “Беларусы, досыць спаць! Гісторыя робіцца сёньня, гісторыю робім мы, і мы пераможам!”

***Виктор Ивашкевич***

# КРИЗИС В БЕЛАРУСИ

## глазами аналитиков, экономистов, политиков и журналистов

### Экономический кризис 2011 года в Республике Беларусь

Кризис вызван многолетним отрицательным сальдо торгового баланса и сохранением административно-командной системы в экономике. Он обострился из-за повышения заработной платы перед выборами 2010 г. Кризис проявляется в нехватке валюты, падении рентабельности импорта, росте цен и падении покупательной способности населения вследствие более чем 100%-ной девальвации белорусского рубля. Из-за недоверия к национальной валюте начался ажиотажный спрос на иностранную.

Несмотря на девальвацию, кризисные явления не исчезли, а инфляция многократно превысила прогнозные показатели. Большинство независимых экспертов считают, что без проведения структурных реформ ситуация продолжит ухудшаться. Кроме того, из-за проводимого руководством страны курса возникли проблемы с получением иностранных кредитов.

*Зарплата на август 2011 в USD*




Инфляция за январь-август составила 53,6%. Цены на продукты питания (в том числе контролируемые государством) за этот же период выросли в среднем на 55,3%, на непродовольственные товары — на 68,6%, на услуги — на 27,4%, на пассажирские перевозки — на 51,1%. При этом зарплата в эквиваленте упала с 500 до 170—220 долларов, то есть ниже уровня Кыргызстана, Молдовы, Армении, Украины и Азербайджана.

### Основные причины кризиса

Среди причин кризиса чаще всего называют:

- Растущий дефицит бюджета, а также торгового и платёжного баланса
- Непрекращающаяся эмиссия белорусского рубля Нацбанком
- Недостаточный уровень валютных резервов
- Командно-административная экономическая модель.

Директор аналитического центра «Стратегия» Леонид Заико считает, что главной причиной кризиса стало директивное увеличение зарплат в последние годы, особенно перед президентскими выборами 2010 г., что привело к опережающему росту потребительского спроса по сравнению с производством и, как следствие, к превышению импорта над экспортом. Президент Польши Бронислав Коморовский видит причину кризиса в «дефиците демократии».

*(По материалам сайта Wikipedia)*

### Белорусская экономика – номинант на премию Дарвина «Самая нелепая смерть года»

**Недавно глава Федерации белорусских проф-союзов Леонид Козик предложил выдвинуть Александра Лукашенко на Нобелевскую премию.**

“Идея построения государства с социально ориен-тированной экономикой, которую первым предложил президент страны – это идея мирового значения, новое слово в теории развития общества и государства”, – заявил он.

**Крах белорусской экономики неизбежен именно потому, что и Лукашенко, и его правительство упрямо не желают признавать очевидного.** Свято уверовав, что “социально-ориентированная экономика” – это вершина экономического развития, они никак не могут понять, отчего “машинка забарахлила”. Проще убедить себя, что враги вокруг плетут злые заговоры, чем признаться в том, что нерентабельная экономика не сможет работать даже по команде. Самое ужасное, что эта простая мысль не приходит белорусским властям в голову.

**Похоже, белорусское правительство вообще не в курсе того, что экономика страны находится в кризисе.** Министры как будто живут в параллельном мире, все силы бросив на то, чтобы убедить народ, будто в Беларуси все хорошо. А поскольку народ в последнее время не очень-то в это верит, задача номер два – усмирять всяческие бунты и давить недовольство в зародыше.

**Белорусские граждане, правда, сказкам про светлое настоящее верят все меньше.** Да и как поверишь, если в апреле средняя зарплата работника бюджетной сферы в Минске равнялось примерно 460 долларов. А после частичного дефолта к июлю зарплата стала равна уже только 260 (в белорусских рублях она осталась прежней – 1 миллион 500 тысяч). Цены на многие товары в это время выросли в 2-3 раза. Родное же “социально-ориентированное” правительство никакого выхода из этой ситуации не предлагает. А те рецепты, что все-таки озвучивают, заставляют белорусов вздрагивать от нехороших предчувствий.

**В стране валютный кризис?** Новая глава Нацбанка Надежда Ермакова, назначенная по принципу личной преданности правителю, в первом же своем выступлении продублировала мысль Лукашенко о том, что в отсутствии валюты виноваты сами жадные белорусы: “Рубля нету, хлеб не можем купить, потому что бережем в кармане 15-20 долларов”, – заявила она. И выход из ситуации тут же нашелся: “Во многих странах валюта продается несвободно, но там экономика развивается и люди живут. Не совсем правильно, чтобы у нас валюта лежала в кармане”. Из чего граждане сделали вывод, что свободное хождение валюты в стране вскоре может быть запрещено. Бензин дорожает? Топливо начинают отпускать по паспортам и в ограниченном количестве, дабы вывезти горючее из страны было нельзя. И так далее.

**В этих условиях всеобщего дефицита и запретов предприятия изобретают собственные рецепты “исправления ситуации”.** На заводе “Гомельдрев”, например, перешли на оплату труда натурой. Часть зарплаты работникам просто начисляют на карточки, с которых они ее снять не могут. Зато могут по этой карточке оплачивать покупки в магазине завода и приобретать изделия собственного предприятия. А если людям нужны деньги на оплату медуслуг или квартплаты?

Руководство завода признается, что пошло на этот шаг не от хорошей жизни. “Мы вариант с натуральной оплатой подсмотрели у коллег в Бобруйске. Таким образом надеемся увеличить оборотные средства. Это решение дает возможность около 500 миллионов рублей ежемесячно оставить на предприятии. Если бы у нас сегодня хватало денег, мы не вводили бы такую форму оплаты”, – оправдывается замдиректора завода. Такая вот получается белорусская модель с “социально ориентированным” лицом.

**Конечно, прав Козик: этот уникальный опыт Александра Лукашенко действительно заслуживает премии. Только не Нобелевской, а другой. Есть, например, премия Дарвина, которая вручается за самое глупое самоубийство. В данном случае речь идет о самоубийстве белорусской экономики.**

*По материалам интернет-журнала «Новая Политика»*

### Запад должен подготовить пакет экономической и политической помощи для Беларуси на случай ухода Александра Лукашенко из власти

**События последних месяцев в Беларуси заставляют США и ЕС выработать основательный подход к белорусским проблемам, основными целями которого станут: активизация демократических веяний в стране и подготовка Беларуси к переходному периоду, после ухода из власти Александра Лукашенко.**

Именно такой представляется роль Соединенных Штатов и Евросоюза в помощи белорусскому населению группе западных экспертов, участвовавших в работе над докладом “Демократические перемены в Беларуси: план действий”. Один из авторов доклада, председатель американской правозащитной организации Freedom House Дэвид Крамер, выступая в комитете по иностранным делам палаты представителей США, заявил:

*“Несомненно, Александр Лукашенко ходит по самому тонкому льду за всю свою политическую жизнь, и мы, возможно, будем праздновать его уход из власти.*

По его словам, “*трудности, переживаемые сейчас белорусами, заставляют многих из них протестовать на улицах, несмотря на риск получить увечья и попасть в тюрьму”. “Это растущее недовольство и раскрепощение людей по всей стране, а не только в Минске, показывает, что белорусы решили больше не бояться”*, — считает Крамер. Он также отметил, что уровень поддержки Лукашенко населением упал ниже 30% — это самый низкий показатель со времени его прихода к власти в 1994 году.

**Авторы доклада опасаются, что в условиях тяжелейшего валютно-финансового кризиса, охватившего Беларусь в последние месяцы, а также усиливающейся международной изоляции режима Александра Лукашенко руководство страны начнет распродажу крупнейших госпредприятий зарубежным инвесторам, чтобы хоть как-то продлить свое пребывание у власти.**

“*Если Лукашенко попытается продлить свое правление путем продажи ценных экономических активов страны Москве, он ослабит независимость и стабильность Беларуси*, — сказал Крамер. — *Вот почему, усиливая давление на режим, Запад также должен подготовить пакет экономической и политической помощи на случай, если Лукашенко сбежит из страны или будет отстранен от власти тем или иным образом*”.

**Возмущенные жестоким подавлением демонстрации в Минске 19 декабря 2010 года и заключением под стражу нескольких кандидатов в президенты и десятков гражданских активистов, аналитики призывают международные орга-низации, и в особенности Международный валютный фонд (МВФ), не выделять никакой финансовой помощи правите-льству Беларуси до освобождения всех политзаключенных.**

“*Поскольку одним из последствий выделения финансовой помощи Беларуси со стороны МВФ может стать непреднамеренное продление срока пребывания Лукашенко у власти, международное сообщество должно послать однозначный сигнал, как оппозиции, так и представителям режима: Запад не собирается спасать нынешнее правительство*”, — гласит текст документа.

“*Чтобы Беларусь заняла свое законное место как европейская нация-государство, необходимо безусловное освобождение всех политических заключенных, отмена репрессивных мер безопасно-сти, поддержка независимых СМИ и гражданского общества, уважение к верховенству закона и свободные и конкурентные выборы*”, — подчеркнул председатель Freedom House.

**Авторы доклада предполагают, что, исходя из ухудшающегося экономического и политического кризиса в Беларуси, день, когда Лукашенко будет отстранен от власти или бежит из страны, не за горами.**

Эксперты считают, что западным правительствам и орга-низациям необходимо немедленно начать подготавливать Беларусь к тяжелому переходному периоду.

“*Чтобы помочь новому правительству, которое придет на смену режиму Лукашенко, западные страны и финансовые организации должны уже сейчас подготовить варианты стратегии адаптации, чтобы обеспечить белорусские власти своевременной и полной поддержкой*”, — считают авторы документа.

*(По материалам БелаПАН)*

### ЕС ГОТОВ ПРЕДОСТАВИТЬ БЕЛАРУСИ ДО 9 МЛРД ЕВРО ПРИ ВЫПОЛНЕНИИ ОПРЕДЕЛЕННЫХ УСЛОВИЙ

Евросоюз готов предоставить Беларуси до 9 млрд. евро на проведение реформ в случае выполнения определенных условий: освобождение и реабилитация политзаключенных, диалог с оппозицией и проведение свободных выборов.

Об этом заявил премьер-министр Польши Дональд Туск 30 сентября на пресс-конференции по итогам саммита «Восточного партнерства» в Варшаве.

На саммите Восточного партнерства принята Декларация, критикующая ситуацию в Беларуси. В документе подчеркивается, что он принят от имени глав государств, правительств и представителей стран Евросоюза.